Філатава, А. М. Тэрытарыяльная палітыка Расійскай імперыі на заходніх межах у канцы XVIII ст.: гістарыяграфія / А. М. Філатава// Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 162-166

**А. М. ФІЛАТАВА (Мінск)**

# ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ НА ЗАХОДНІХ МЕЖАХ У КАНЦЫ XVIII ст.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Падзеі, якія папярэднічалі падзелам Рэчы Паспалітай (Барская і Таргавіцкая канфедэрацыі, паўстанне 1794 г.) і самі падзелы выклікалі вялікую цікавасць з боку даследчыкаў розных часоў і краін [1]. У гістарычных даследаваннях былі прааналізаваны: знешняя палітыка Расіі, Прусіі і Аўстрыі — галоўных віноўнікаў падзелаў Рэчы Паспалітай, эвалюцыя яе грамадскага і палітычнага ладу, канфедэратыўны і паўстанцкі рух (які таксама называўся і руска-польскімі войнамі), стварэнне расійскіх органаў улады на далучанай тэрыторыі, асобныя постаці вядомых дзеячаў і інш.

Першым пытаннем, якое ставілася аўтарамі, было пытанне: хто павінен у падзелах Рэчы Паспалітай (або Польшчы)? Расійская імперыя і Кацярына ІІ? Аўстрыйская імперыя і Марыя-Тэрэзія? Прускае каралеўства і Фрыдрых ІІ? І як трапна пісаў польскі гісторык К. Валішэўскі: «Рускія гісторыкі крута, ад кнігі да кнігі, зменьвалі свой погляд на гэтае далікатнае пытанне, то тлумачачы падзел Польшчы законамі этнічных груповак, то прасцей — законам права моцнага. Гэта адбылося і з самым заметным з іх, з Салаўёвым. Нямецкія гісторыкі выбіваліся з сіл, каб ачысціць памяць Фрыдрыха ад абвінавачванняў у тым, што ён быў зачыншчыкам гэтай справы. Але довады іх аспрэчваліся ў Расіі. Адно толькі недвухсэнсава ўстаноўлена і тым і другім бокам— недастойны характар гэтага палітычнага пагаднення» [2, 397].

Так, не толькі С. Салаўёў, але і Н. Карэеў, Ф. Сміт і іншыя расійскія гісторыкі [3] схіляліся да думкі, што ў падзелах Польшчы была вінавата не Расія, а Прусія. На погляд Ф. Сміта, у час другога падзелу Кацярына ІІ мела правы на адкрытую вайну, але яна, «предпочитая кроткие, мирные меры», вырашыла пайсці на вядомы ў падобных выпадках ў Польшчы сродак — канфедэрацыю [4, 319]. Праўда, наконт падобнага характару мірных сродкаў не зусім быў зго-



дзен Н. Кастамараў, які пісаў, што захопленая рускай зброяй польская тэрыторыя зрабілася «ўласнасцю Расіі па праву захопніка» [5, 860]. Але пры гэтым ён апраўдваў, у некаторай ступені, ваенныя дзеянні тым, што маса рускага народа, які знаходзіўся пад уладай Польшчы, несумненна «желала соединения с Россиею» [5, 767].

З другой паловы XIX ст. і далей пачалі з'яўляцца гістарыяграфічныя працы, якія аналізавалі папярэднія даследаванні [6]. Так, М. О. Каяловічу, які прааналізаваў шэраг прац па падзелам, не вельмі падабалася ідэалізацыя некаторымі аўтарамі палітыкі Кацярыны ІІ. Ён лічыў, што Кацярына ІІ, замест таго каб забіраць ад Польшчы рускія вобласці і абараняць яе ад немцаў, дзейнічала так, што выходзіла наадварот — немцы паспяхова дабівалі краіну. А ў той жа час у Беларусі многія дзесяткі тысяч рускага народа з нецярпеннем чакалі аднаўлення рускай улады, для таго каб пакінуць гвалтоўна навязаную унію і вярнуцца ў праваслаўе. І толькі ў часы другога і трэцяга падзелаў Кацярына ІІ дзейнічала ў чыста рускіх інтарэсах [7, 349, 350]. На яго думку, гэта было звязана з «вядомай тэорыяй рэлігійнай верацярпімасці» імператрыцы: абаронай Расіяй правоў не толькі праваслаўных, але і пратэстантаў, дазволу ордэну езуітаў дзейнічаць на Беларусі.

Аб палітыцы ў адносінах да заходніх зямель пісаў і А. Карнілаў, які адзначыў, што пытанне аб адваяванні старажытных рускіх зямель, як першапачатковай дзяржаўнай задачы, было цалкам вызначана яшчэ пры Іване ІІІ [8, 8]. Ф. Кудрынскі вылучыў два галоўных аспекты знешняй палітыкі Расіі адносна заходніх меж: першы — вызваленне «православно-русского населения» Польшчы ад каталіцкага панавання, а для гэтага неабходна было адабраць у яе «древнерусские земли»; другі — неабходнасць дасягнуць «естественных тер-

риториальных границ» на поўдні дзяржавы, для чаго патрэбна забраць у турак Крым і паўночныя берагі Чорнага мора. І аўтар прыйшоў да высноў, што польскімі і турэцкімі войнамі імператрыца давяла

тэрыторыю рускай дзяржавы да сваіх «естественных границ»: на поўдні — да мора, на захадзе — да старой «этнографической черты славянства [9, 89, 96—98].

Гэтыя працы выключалі Расію з ліку віноўнікаў падзелаў і разглядалі яе ўдзел у гэтым працэсе як працяг палітыкі збірання рускіх зямель. Такія падыходы з'яўляліся агульнымі для ўсёй дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі, як кансерватыўнага, так і ліберальнага накірунку.

К пачатку XX ст. ужо склалася канцэпцыя тэрытарыяльнай палітыкі Расійскай імперыі. У 1905 г. у працы Л. Ціхамірава, які асобна вылучыў у манаграфіі главу «Тэрытарыяльная палітыка», адзначалася, што гэтая палітыка павінна быць адной з галоўных клопатаў дзяржавы. На яго думку, пакуль дзяржава не дасягнула канчатковых меж, то яе тэрытарыяльная палітыка лічыцца не



завершанай, не дасягнуўшай канчатковых мэт. І ў адносінах да Расіі, аўтар лічыць, што яе тэрытарыяльная палітыка, якая пачалася з Рурыкавічаў, яшчэ не завершылася [10, 632—639].

У адрозненне ад дарэвалюцыйных расійскіх гісторыкаў — польскія гісторыкі ў розныя часы лічылі галоўнай віноўніцай падзелаў Расію, але ўжо ў другой палове XIX ст. з'яўляюцца працы, аўтары якіх маюць іншы пункт гледжання і галоўнай прычынай трагедыі лічылі ўнутраны разлад у дзяржаве. Савецкая гістарыяграфія гэтай праблемы даволі мізэрная. Пры неабходнасці тэма падзелаў уключалася ў розныя падручнікі і кнігі па знешняй палітыцы Расіі, але ў іх адсутнічалі якія-небудзь новыя матэрыялы і ацэнкі ў параўнанні з дарэвалюцыйнай гістарыяграфіяй.

Новы этап у даследаваннях тэрытарыяльнай палітыкі Расійскай імперыі пачаўся з 90-х гг. XX ст., калі былі зроблены спробы не толькі сабраць новы фактычны матэрыял, аднавіць стары, але і тэарэтызаваць. Сярод сучасных расійскіх даследчыкаў выклікае цікавасць праца Б. Міронава [11], які вылучыў фактары тэрытарыяльнай экспансіі імперыі. На яго думку, экспансію Расіі стымулявалі геапалітычныя меркаванні: забеспячэнне трывалых меж, незамярзаючых партоў, неабходнасць перашкодзіць захопу прыгранічных тэрыторый сапернікамі або ўключыць іх у сферу свайго ўплыву. І нягледзячы на тое, што ў тыя часы кіруючая эліта разглядала Расію як узаконенага спадкаемца Кіеўскай Русі і Залатой Арды і імкнулася «собрать русские земли» пад скіпетр рускага цара, на думку аўтара, рускія ніколі не зганялі туземнае насельніцтва ў рэзервацыі, не забіралі зямель, не забаранялі міграцыю ні ў імперыі, ні за яе межамі [11, 20, 26].

Расійскія даследчыкі не забываюць і пра старыя, часоў Расійскай імперыі, думкі, што сведчыць аб іх не змяніўшымся і да нашага часу пункце гледжання. Так, лічыцца, што ў ходзе падзелаў Рэчы Паспалітай завяршыўся прагрэсіўны і гістарычна абумоўлены працэс «воссоединения» Беларусі і Украіны з Расіяй і гэта «отвечало воле и закономерностям исторического развития украинского, белорусского и русского народов». І зберагаецца ўсё той жа міф аб тым, што Расія не захоплівала, а вяртала свае землі: «в ходе разделов Польши Россия не приобрела ни пяди национальной польской территории» [12, 196, 197].

Расійскі даследчык П. Стегній адхіліў распаўсюджаны тэзіс аб тым, што асноўным матывам дзеянняў Кацярыны II у польскім пытанні было вяртанне ў склад Расіі тэрыторый пераважна з праваслаўным насельніцтвам. На яго думку, падобныя настроі былі абсалютна нехарактэрны для становішча пачатку 1770-х гг., калі замышляўся і ажыццяўляўся першы падзел Рэчы Паспалітай. Нацыянальная матывацыя ўдзелу Расіі ў падзелах, на яго думку, з'яўляецца



толькі ў перыяд другога і трэцяга падзелаў Польшчы [13, 140—141], што магчыма таксама не вельмі адпавядае рэчаіснасці.

На думку беларускага даследчыка дадзенай праблемы Я. Анішчанкі, адказнасць за падзелы дзяржавы ляжыць на Кацярыне II. Аўтар матывіруе гэта тым, што расійская імператрыца з 1768 г. непасрэдна адказвала за непадзельнасць рэспублікі як яе апякунка і гарантка [14, 135, 136, 402].

Такім чынам, у развіцці гістарыяграфіі падзелаў Рэчы Паспалітай можна вылучыць некалькі перыядаў: 1795—1917 гг. — дастаткова інтэнсіўнае вывучэнне падзелаў Рэчы Паспалітай у дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі, польскай, французскай, англійскай і нямецкай. У 1918—1990 гг. гэтыя пытанні вывучаліся ў асноўным за межамі СССР, у значнай ступені ў Польшчы. Савецкая, у тым ліку і беларуская гістарыяграфія таго часу, абапіраючыся на дарэвалюцыйную гістарыяграфію, але з выкарыстаннем

марксісцка-ленінскай тэорыі аб класавай барацьбе, пісала аб станоўчых выніках «воссоединения» тэрыторыі Беларусі з Расіяй. У сучаснай расійскай і польскай гістарыяграфіі адбылося вяртанне да далейшага вывучэння фактычных матэрыялаў па дадзенай праблеме. Вызначаюцца і некаторыя спробы яе тээрэтычнага абаснавання ў рамках тэрытарыяльнай палітыкі Расійскай імперыі. Нягледзячы на некаторыя зрухі, сучасная беларуская гістарыяграфія ў галіне дадзенай праблемы застаецца на ступені друкавання фактычных матэрыялаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. Rulhiйr, C. C. Histoire de l'anarchie de Pologne et du demembrement de cette republique / C. C. Rulhiйr. Paris,1807; Lelewel I. Panowanie krula Polskiego Stanislawa Augusta Poniatowskiego. Bruxelle, 1847; Raumer F. Polens Untergang. Leipzig, 1832; Гегемейстер Ю. А. О распространении Российского государства с единодержавия Петра 1 до смерти Александра 1. СПб., 1838; Соловьев С. М. История падения Польши. М., 1863; Костомаров Н. И. Последние годы Речи Посполитой. СПб., 1870; Иловайский Д. И. Гродненский сейм 1793 г. М., 1870; ДеПуле М. Станислав-Август в Гродно. Литва в 1794—1797 гг. СПб., 1871; Beer F. Die erste Teilung Polens. Wien, 1873; Bobrzyński M. Dzieje Polski w zarzsie. War., 1880; Кареев Н. И. Польские реформы XVIII века. СПб., 1890; Чечулин Н. Д. Внешняя политика России в начале царствования Екатерины II. СПб., 1896; Kraszewski J. I. Polska w czasie trzech rożbiorow. 1772—1794. Warszawa, Krakyw, 1903; Кудринский Ф. А. Императрица Екатерина II и разделы Польши. Вильно. 1905; Корнилов А. А. Русская политика в Польше со времени разделов до начала XX века. Пг., 1915; Lord R. H. The Second Partition of Poland. Cambridge, London, 1915; Лаппо И. И. Западная Россия и ее соединения с Польшей в их историческом прошлом. Прага,1924; Zytkowicz L. Litwa i Korona w r. 1794. Wilno, 1937; Konopcznski W. Konfederacij barska. T. 1, 2. War., 1938; Mьller M. Die Teilung Polens 1772, 1793, 1795. Mьnchen, 1984; Wolanski A. Wojna polskoo rosyjska 1792 r. War., 1996; Юхо Я. А. За вольнасць нашу і вашу. Мінск, 1990; Філата-





ва А. Тры падзелы Рэчы Паспалітай // Крыжовы шлях. Мінск, 1993. С. 96—117; Емельянчык У. Паланез для касінераў. Мінск, 1994; Szyndler B. Powstanie kościuszkowskie 1794. War., 1994; Cegielski T., R dziela L. Rozbiory Polski: 1772—1793—1795. War., 1999; Grodzinski S. Polska w czasach przelomu: 1764—1815. Krakyw, 1999; Філатава А. Прарускія тэндэнцыі ў палітычнай дзейнасці магнатаў Вялікага княства Літоўскага (1762—1795 гг.) // Unia Lubelska i tradycje integracyjne w Europe SrodkowooWshodniej. Lublin. 1999; Zielinska Z. Studia z dziejow stosunkow polskoorosyjskich w XVIII wieku. War., 2001; Исламов Т. М. Заговор против Польши. О роли русско-прусско-австрийского альянса 1772—1773 в разделе польского государства // Польша и Европа в XVIII веке: международные и внутренние факторы разделов Речи Посполитой. М., 1999. С. 124—125; Национальные окраины Российской империи: становление и развитие системы. М., 1997; Стегний П. В. Разделы Польши и дипломатия Екатерины II. М., 2002; Анішчанка Я. Інкарпарацыя. Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. Мінск, 2003.

2. Валишевский, К. Роман императрицы / К. Валишевский. СПб., 1908.

3. Смитт, Ф. Суворов и падение Польши / Ф. Смитт. СПб., 1866; Соловьев С. М. История падения Польши. М., 1863; Кареев Н. И. Польские реформы XVIII века. СПб., 1890; Кареев Н. И. Падение Польши в исторической литературе. СПб., 1888.

4. Смитт, Ф. Суворов и падение Польши.

5. Костомаров, Н. И. Последние годы Речи Посполитой / Н. И. Костомаров. СПб., 1870.

6. Кареев, Н. И. Падение Польши в исторической литературе / Н. И. Кареев. СПб., 1888; Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. СПб., 1901; Дьяков В. А. Польская тематика в русской историографии конца XIX— начала XX века // История и историки. 1978. М., 1981; Кручковский Т. Т. Польская проблематика в русской историографии второй половины XIX в. // Наш радавод. Кн. 6. Ч. 2. Гродна, 1994. С. 219—417; Носов Б. В. Разделы Речи Посполитой в трудах польских и российских историков второй половины XIX — начала XXв. и становление современной историографии // Российско-польские научные связи в XIX—XX вв. М., 2003. С. 103—116.

7. Коялович, М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям / М. О. Коялович. СПб., 1901.

8. Корнилов, А. А. Русская политика в Польше со времени разделов до начала XX века / А. А. Корнилов. Пг., 1915.

9. Кудринский, Ф. А. Императрица Екатерина II и разделы Польши / Ф. А. Кудринский. Вильно, 1905.

10. Тихомиров, Л. А. Монархическая государственность / Л. А. Тихомиров. СПб., 1992.

11. Миронов, Б. Н. Социальная история России / Б. Н. Миронов. Т. 1. СПб., 1999.

12. История внешней политики России. XVIII век. М., 1998.

13. Стегний, П. В. Разделы Польши и дипломатия Екатерины II / П. В. Стегний. М., 2002.

14. Анішчанка, Я. Інкарпарацыя. Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай / Я. Анішчанка. Мінск, 2003.